































Я ем
мю́слі.



Ягó р еў
мус.



Лю́ся е́ла
пюрэ́.



Ю́ля е́ла
суп.



Малы́я е́лі сала́ту і мя́са.
Сма́чна!

с л м а і ы у ў г п т о э р ч н

ем | еў | е́ла | е́лі
--- | --- | --- | ---
пае́м | пае́ў | пае́ла | пае́лі





У сасны́ і е́лкі ко́лкія галі́нкі. Іго́лкі ў е́лкі каро́ткія. Які́я яны́ ў сасны́?

У сасны́  малы́я.

Які́я яны́ ў е́лкі?

## Лясны́я ласу́нкі

Каля́ е́лак мно́га ма-сля-ко́ў. На суку́ е́лкі — . Яна́ трыма́е малы́ масля́к. Гэ́та яе́ ласу́нак.



Тут і ласі́. Яны́ такса́ма на-тра́-пі-лі на ро́ссып маслякоў.



Стары́ масля́к — ласу́нак слімака́. Сма-ка-та́!



Чый ласу́нак стары́ масля́к?
У каго́ малы́ масля́к?






Правообладатель Академия образования








Сэм сем

| | |
|---|---|
| сэ | се |
| лэ | ле |
| мэ | ме |
| гэ | ге |
| пэ | пе |
| нэ | не |
| кэ | ке |

гэ́ты
ге́тры

сэ́нс
сеа́нс

пэ́ўны
пе́ўні

со́нейка
со́нечны

карэ́та
ракé́та

крэ́кер
ке́глі

Ге́на
Ле́ра

сеў
се́ла

се́лі
перасе́лі

арэ́лі
карусе́лі

## У па́рку



Ле́ра і Ге́на ка-та́-лі-ся на карусе́лі. Ле́ра се́ла на каня́, а Ге́на — на слана́. По́тым Ге́на сеў у раке́ту, а Ле́ра — у карэ́ту. Пасля́ гэ́тага Ле́ра і Ге́на пе-ра-се́-лі на арэ́лі.

Яны́ ката́ліся і смя-я́-лі-ся.

с л м а і ы у ў г п т о э р ч н

## Плане́ты Со́нечнай сістэ́мы




## Сны Пе́трыка

Ко́смас — гэ́та ма́ра Пе́трыка. У яго́ мно́га кніг пра ко́смас. І сны такса́ма пра ко́смас. У сне Пе́трык — ка-сма-на́ўт. Яго́ раке́та пра-ля-та́-е ўсю Гала́ктыку. Пятро́ лята́е на плане́ты Мер-ку́-рый, Марс, Юпі́тэр, Сату́рн, Ура́н і Непту́н.



раке́та
каме́та
плане́та

к й я ю е



Правообладатель Академия образования